УДК 9(476)

# Беларускі калабарацыянізм у англамоўных выданнях ЗША

Мыцько В.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Геапалітычнае становішча Беларусі, яе гістарычны лёс прадвызначыў калабарацыянізм некаторай часткі насельніцтва раней - пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, у перыяд нашэсця Напалеона, I Сусветнай вайны (1914 - 1918) і Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гадоў.

Праблемы беларускага калабарацыянізму знайшлі адлюстраванне ў замежнай навукова-даследчай літаратуры. Разгляд гэтага пытання мае месца і ў сувязі з айчыннай гісторыяй, ў дачыненні да канкрэтных падзей нямецкай акупацыі Беларусі ў часы II Сусветнай вайны. Так, яшчэ ў 1956 годзе ў ЗША выйшла кніга даследчыка гісторыі Беларусі Нікаласа Вакара "Беларусь. Станаўленне нацыі». У частцы манаграфіі пад назвай "Калабарацыянізм" (стар. 176) аўтар звяртае увагу, что Германія вырашыла зрабіць стаўку ў будучым на розныя антысавецкія групоўкі, якія аказаліся па-за межамі БССР да 1939 г. – частка знаходзілася ў Заходняй Беларусі, іншыя знайшлі прыстанішча ў Германіі, Чэхіі пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР. Але толькі нешматлікія з іх жадалі супрацоўнічаць з немцамі ў будучым. Так, В.Захарка, які лічыўся прадстаўніком ў Празе "сімвалічнай" Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), на прапанову немцаў узначаліць так званы беларускі вызваленчы рух адмовіўся. Між тым недалёка ад Берліну за некалькі дзён да нападу на СССР былі падрыхтаваны два вялікіх памяшкання для будучага марыянетачнага беларускага ўраду, была распрацавана нават уніформа для т. зв. Беларускай вызваленчай арміі. Але гэта акцыя не была здзейснена, таму што за межамі Беларусі не была знойдзена дастатковая колькасць асоб, і , як звяртае ўвагу Вакар, па меркаванню немцаў "Беларусь была тэрыторыяй без гістарычных традыцый, якія б паклалі шлях да фарміравання дзяржаўнай эліты" (стар. 177). Прыхільнікаў Германіі, яе фашысцкай ідэалогіі знайшлося зусім нямнога. Адным з такіх эмігрантаў Вакар называе Ф. Акінчыца, які з 1930 года заснаваў у Вільні так званае Беларускі нацыянал-сацыялістычны рух

(беларускую прафашысцкую партыю), якая намагалася прыцягнуць на свой бок беспрацоўную моладзь з Заходняй Беларусі. Гэты рух не набыў вялікай колькасці (каля некалькі сот чалавек).

Пытанне калабарацыянізму Вакар разглядае у раздзеле "Беларускі нацыяналізм" і тут звяртае увагу, што сацыяльна-палітычнай асновай супрацоўніцтва з акупантамі з'яўляліся прадстаўнікі розных палітычных партый Заходняй Беларусі – ад сацыялістаў да хрысціянскіх дэмакратаў. Разглядаючы няпростае становішча калабарацыянізма на Беларусі, аўтар звяртае ўвагу на дзейнасць тых, хто жадаў вырашэння асабістых інтарэсаў такіх, як Р.Астроўскі, якога немцы вылучылі кіраўніком мясцовай беларускай адміністрацыі, І. Ермачэнка, яго дзейнасць пры Кубэ, мэра Мінска В.Тумаша, але і адзначае тых, хто добра разумеў, што яны былі проста разменнай манетай пры германскім акупацыйным рэжыме, хто нават спрабаваў стварыць групы, якія кіраваліся лозунгам "Ні Германія, ні Саветы, ні Польшча" (стар. 196).

Тое, што акупанты выкарыстоўвалі калабарантаў у сваіх мэтах, бачна па той палітыцы, на аснове якой яны спрабавалі падштурхнуць людзей да супрацоўніцтва – гэта дыскрэдытацыя савецкай даваеннай улады (прымусовая калектывізацыя, рэпрэсіі), спроба ускладніць міжнацыянальныя адносіны. Як вядома, Беларусь была шматнацыянальнай краінай са значнай колькасцю яўрэйскага насельніцтва. Гэтае пытанне мела месца на другім Усебеларускім кангрэсе 27 чэрвеня 1944 г. (стар.204).

Лёсу беларускіх калабарантаў у паслеваенны час было прысвечана грунтоўнае даследаванне юрыста па адукацыі Джона Лофтуса "Беларускі сакрэт". Абапіраючыся на дакументальныя матэрыялы Дзяржаўнага дэпартамента ЗША і іншых установ, аўтар паспрабаваў прасачыць пасляваенны лёс калабарантаў. Як вядома, большасць з іх пасля II Сусветнай вайны трапіла ў Заходнюю Германію, Аўстрыю і іншыя краіны Захаду. Знаходзячыся ў так званых лагерах ДП (для перамяшчаных асоб), яны перш за ўсё падкрэслівалі свае антыкамуністычныя адносіны да СССР. Праз міжнародныя арганізацыі яны спрабавалі выехаць у розныя бакі свету. Да мая 1945 года ў Германіі знаходзілася найвышэйшае беларускае палітычнае кіраўніцтва часоў нямецкай акупацыі 1941-1944

гадоў на чале з Р. Астроўскім. У 1948 годзе 400 тысяч тых, хто супрацоўнічаў з немцамі ў Беларусі, Украіне і Прыбалтыцы, трапілі ў ЗША, а ў 1952 годзе туды яшчэ з'ехалі 300 беларускіх калабарантаў. Большасць з іх стала амерыканскімі грамадзянамі (стар.104, 105). Так, грамадзянінам стаў Р.Астроўскі, былы прэзідэнт марыянетачнага Беларускага ўрада пры немцах, Ф. Кушаль – кіраўнік беларускай паліцыі, які дапамог адправіць ў гета 40 тыс. прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва, С. Станкевіч, які кіраваў забойствам 7 тыс. яўрэяў у Барысаве, Э. Яцук – часовы адміністратар г.Клецка, які ўдзельнічаў у забойстве 5 тыс. яўрэяў і інш. Увогуле, Лофтус звяртае ўвагу перш за ўсё на адносіны калабарантаў да яўрэйскага насельніцтва і іх далейшы лёс у ЗША.

Трэба адзначыць, што другі шырока вядомы даследчык беларусаў у ЗША В. Кіпель у кнізе "Беларусы ў ЗША" адзначае, што ў асяроддзі тых, хто трапіў у Амерыку, атрымаўся раскол. Частка эмігрантаў не жадала мець ніякіх спраў з былымі супрацоўнікамі-нацыстамі. Яны лічылі, што настаў час заснаваць новы беларускі прадстаўнічы орган, які б не выклікаў асацыяцый з падзеямі II Сусветнай вайны. Сімвалам гэтага, па іх меркаванню, было стварэнне новай рады БНР з ліку тых, хто знаходзіўся ў Заходняй Еўропе і не меў дачынення да фашысцкай Германіі. Так было вырашана аднавіць раду БНР у іншым складзе (стар.160-162). (Але можна паставіць пытанне – якой рэспублікі?).

В. Кіпель звяртаў увагу, што ў сувязі з выхадам кнігі Д. Лофтуса "Беларускі сакрэт" у ЗША была створана Беларуска – амерыканская кааліцыя супрацьуздзеяння паклёпам, галоўнай мэтай якой было аспрэчыць дадзенае Лофтусам.

Трэба адзначыць, што аўтары пералічаных даследаванняў не звярталі ўвагі на галоўнае – беларускі народ у сваёй масе не падтрымаў калабарантаў. Нават у той час, калі беларускія калабаранты супрацоўнічалі з фашыстамі, знаходзіліся сотні беларусаў, якія дапамагалі тым жа яўрэям бегчы ад дэпартацыі ў лагеры смерці. Такія людзі атрымалі нават назву Righteous Gentlies (сапраўдныя благародныя) Аб гэтым напісаў у сваім даследаванні В. Вертсман "Righteous Gentlies сярод нацый: выбранае бібліяграфічнае даследаванне".